# Францысканскі кляштар

*Калнін, В.В. Францысканскі кляштар / В.В. Калнін // Калнін, В.В. Гродна ў дыялогу стагоддзяў: альбом / В.В. Калнін. - Мінск: Кавалер, 2008. - С. 102-108.*



Калісьці з бернардзінскай гары, як з флагманскага карабля, можна было назіраць усю багатую флатылію гарадзенскіх храмаў. Зараз некаторых караблёў з той флатыліі ўжо няма: непрыкметна згарэла на агнявым рубяжы занёманская сінагога, нібы ў тумане растварылася і знікла назаўсёды фара Вітаўта, замест спісанага і разабранага кляштара бернардзінак “усплыло” няведамага стылю стварэнне - драмтэатр. На левым беразе ракі цудам ацалеў кляштар францысканцаў. Таксама як і бернардзінскі, падобны на карабель, толькі меншага памеру і нізка пасаджаны, ён падаецца прагулачным параходам, і наведванне яго абяцае быць цікавым.

Галоўная роля ў архітэктуры ўсяго ансамбля прыпадае на вежу-званіцу. Здаецца, што яе мяккія, чыстыя абрысы сфармаваны павевамі ўсялякіх вятроў і абмыты імклівымі водамі ракі. Мякка закругленыя вуглы і навершы замацаваны па вертыкалі далікатнымі пілястрамі і апярэзаны па кожным ярусе шырокімі карнізамі з тонкай прафіліроўкай. Вялікія арачныя адтуліны-вокны надаюць званіцы манументальную значнасць, а круглыя люкарны над імі - маўклівую гучнасць. Тонкая архітэктурная мелодыка, вытрыманая на нюансах, - характэрная рыса стылю ракако, які панаваў у другой палове 18-га стагоддзя.

Унутры самога касцёла першае ўражанне - святло і лёгкасць. Асноўная колерная танальнасць - бель і пазалота, адсюль чысціня і бліскучасць, як і павінна быць на караблі. Дэкор пілястраў, карнізаў значна багацейшы, чым у бернардзінскім касцёле, і выкананы ён тонка, далікатна, пераход на скляпенні лёгкі, яны ўздымаюцца як ветразі, а карнізныя профілі - гэта тросы, што ўтрымліваюць тыя



ветразі. Нездарма галоўная ўнутраная прастора храма завецца нэф - з перарobленага лацінскага “карабель”.

Дадатнае ўбранне касцёла (алтары, амбон, лаўкі для малення і іншае) па каляровай танальнасці не супадае з навакольным асяроддзем. Між тым колерны кантраст дапамагае успрыняць багацце святла і далікатнасць афармлення сценаў і скляпенняў. Галоўны алтар, выкананы з дрэва і пафарбаваны пад мармур, выглядае высокім стажком, уціснутым паміж белымі сценамі галоўнага нэфа. Сярод мноства дэкаратыўных і скульптурных дэталяў увагу прыцягвае разьба верха і другога яруса, а таксама фігурная кампазіцыя “Укаранаванне Дзевы Марыі” з прымацаванай унізе выявай святога Максімільяна Кольбе, які менавіта ў гэтым светлым касцёле пачынаў сваё змаганне за чысціню веры.

Пры развітанні з гэтым помнікам варта яшчэ раз паглядзець на яго з вышыні процілеглага берага. Пекная вежа надоўга прыкоўвае ўвагу і часам здаецца, што гэта не Нёман цячэ насустрач касцёлу, а белы карабель лагодна пасоўваецца ўверх па рацэ. Магчыма, пры ўзвядзенні вежы менш думалі пра манументальнасць, а болей пра выкарыстанне яе элементаў - арачных вакон для вольнага касцёльнага перазвону, а круглых - для разліцця святла навокал. Тады можна гаварыць яшчэ пра адно прызначэнне званіцы - быць маяком для караблёў і лодак, што праплываюць міма.

Лодкі на Нёмане называюць “чайкамі”; на белую чайку падобны і сам касцёл, спрадвечны для іх помнік.